БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 882.6 (092)

**БОРБАТ Таццяна Іванаўна**

# ТВОРЧАСЦЬ СЯРГЕЯ ГРАХОЎСКАГА: АСАБЛІВАСЦІ ІДЭЙНА-МАСТАЦКАЙ ЭВАЛЮЦЫІ

10.01.01 – беларуская літаратура

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Мінск – 2004

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Работа выканана ва Установе адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук, дацэнт **М.Ф.Шаўлоўская,** Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка", кафедра беларускай літаратуры

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук, прафесар **І.Ф.Штэйнер,** Установа адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны", кафедра беларускай літаратуры;

кандыдат філалагічных навук, дацэнт **А.Л.Верабей,** БДУ. кафедра беларускай літаратуры XX стагоддзя

Апаніруючая арганізацыя – Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М.Машэрава"

Абарона адбудзецца 21 мая 2004 года ў 16 $\frac{30}{}$ гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 у Беларускім дзяржаўным універсітэце (220050, г. Мінск, вул. К.Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара 222-33-66).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта (г. Мінск, пр-т Ф. Скарыны, 4).

Аўтарэферат разасланы __ красавіка 2004 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
прафесар **А.І.Бельскі**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы даследавання**. Для найбольш грунтоўнага вывучэння гісторыі літаратуры неабходна ўводзіць у навуковы ўжытак імёны і мастацкія творы тых пісьменнікаў, якія па пэўных прычынах не сталі прадметам спецыяльнага разгляду ў літаратуразнаўстве, бо ў выніку "карціна літаратурнага развіцця <...> драбніцца, знікае, саступаючы месца шэрагу разрозненых партрэтаў выбраных пісьменнікаў-класікаў"[1].

Творчасць С.Грахоўскага (1913 – 2002), своеасаблівая і яскравая старонка ў гісторыі развіцця беларускай паэзіі і прозы другой паловы ХХ стагоддзя, на жаль, не атрымала належнага літаратуразнаўчага асэнсавання. Мастацкі свет пісьменніка – арыгінальны і шматгранны – асобнымі штрыхамі ахарактарызаваны ў шматлікіх рэцэнзіях і артыкулах. Аднак многія з адлюстраваных у іх меркаванняў і высноў патрабуюць пэўнага ўдакладнення і нават перагляду ў рамках аднаго цэласнага і канцэптуальнага даследавання, што прадыктавала выбар тэмы і абумовіла яе актуальнасць.

Дадзеная работа – першае дысертацыйнае даследаванне, прысвечанае творчасці С.Грахоўскага, у якім разглядаюцца этапы станаўлення і развіцця яго творчай індывідуальнасці ў кантэксце часу[2]. Аналіз успрыняцця пісьменнікам часу ў розныя перыяды яго творчасці спрыяе выяўленню своеасаблівасцей лірычных твораў, заканамернасцей развіцця паэтычнага мыслення пісьменніка, эвалюцыі лірычнага характару, жанравай залежнасці лірыкі ад канкрэтнага часу на адпаведным этапе літаратурнай дзейнасці.

Актуальнасць тэмы даследавання вызначаецца яшчэ і фактарамі сацыяльнымі: С.Грахоўскі часта выступаў на радыё, тэлебачанні, на старонках друку не толькі як паэт, але і як летапісец свайго часу[3]. Таму разгляд яго літаратурна-грамадскай дзейнасці пашырые больш аб'ёмнай і аб'ектыўнай характарыстыцы беларускай літаратуры другой паловы ХХ стагоддзя.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Работа выканана ў адпаведнасці з планавай тэмай кафедры беларускай літаратуры Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка" "Актуальныя праблемы вывучэння і выкладання беларускай літаратуры на сучасным этапе", мае пошукавы характар, уваходзіць у праграму комплексных літаратуразнаўчых даследаванняў, звязаных з распрацоўкай праблем новай "Гісторыі беларускай літаратуры" (рэг. № 20014909). Тэма працы зацверджана Вучоным саветам БДПУ (загад № 5 ад 4 сакавіка 1997 года).

---

[1] Белецкий А.И. Избранные труды по теории литературы. – М.: Просвещение, 1964. – С. 329.

[2] Маецца на ўвазе канкрэтны гістарычны час – 30 – 90-я гады ХХ стагоддзя.

[3] Граховский С. "Уроки прошлого забывать преступно": О репрессированных белорусских писателях: Беседа с поэтом / Записала Г.Айзенштадт // Сов. Белоруссия. – 1988. – 12 июня. – С. 2 – 3; Грахоўскі С. Прашу ласку за скалечанае жыццё невінаватых: Зварот С.І.Грахоўскага да народ. дэпут. Беларусі // Звязда. – 1990. – 18 снеж. – С. 3; Грахоўскі С. Праўда застаецца дэфіцытам: Выступ. на Х з'ездзе Саюза пісьмен. Беларусі // Літ. і мастацтва. – 1990. – 18 мая. – С. 6; Грахоўскі С. "Аддано справе адраджэння...": На з'ездзе пісьменнікаў Украіны // Літ. і мастацтва. – 1991. – 3 мая. – С. 4; Грахоўскі С. Беззаконне замаруджанага дзеяння // Нар. газ. – 1992. – 14 мая. – С. 1.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Мэта і задачы дысертацыйнага даследавання.** *Мэта* даследавання – прасачыць этапы станаўлення творчай індывідуальнасці С.Грахоўскага, вызначыць пры гэтым дамінантныя рысы яго паэзіі і прозы, выявіць жанравыя асаблівасці і раскрыць адметнасці стылю, асэнсаваць творчасць пісьменніка ў кантэксце беларускай літаратуры XX стагоддзя.

У сувязі з гэтым пастаўлены наступныя *задачы*:

– на аснове цэласнага аналізу ранніх вершаў С.Грахоўскага, змешчаных у даваеннай перыёдыцы, выявіць агульныя заканамернасці яго творчасці канца 20-х – пачатку 30-х гадоў, абумоўленыя ўплывам сацыяльна-палітычных абставінаў;

– раскрыць своеасаблівасць мастацкага мыслення паэта ў вершах, напісаных у канцы 50-х – першай палове 80-х гадоў, у якіх уздымаюцца актуальныя праблемы гэтага часу;

– вызначыць і прааналізаваць мастацкую адметнасць, сацыяльна-палітычную і маральную праблематыку апавяданняў пісьменніка, што ўвайшлі ў празаічныя зборнікі “Які вялікі дзень”, “Сустрэча з самім сабою”;

– паказаць шматграннасць і шматстайнасць раскрыцця тэмы памяці ў паэзіі С.Грахоўскага, якая набывае адзнакі лейтматыву яго творчасці, атрымлівае наватарскае раскрыццё, патрабуе адпаведнай макра- і мікравобразнасці;

– адзначыць адметнасць і своеасаблівасць лірыкі С.Грахоўскага 80 – 90-х гадоў, ахарактарызаваць яе жанравую спецыфіку;

– даследаваць сацыяльныя і маральныя аспекты праблемы “чалавек і прырода” ў творчасці пісьменніка, паказаць узаемасувязь экалагічных і духоўных праблем, непаўторнасць і яскравасць сродкаў паэтызацыі прыроды; акрэсліць наватарства мастацкага асэнсавання С.Грахоўскім тэмы Радзімы;

– вызначыць ролю этычнага фактара пры стварэнні персанажаў аўтабіяграфічнай аповесці “Зона маўчання”, паказаць прыёмы яго рэалізацыі праз сістэму мастацкіх сродкаў.

**Аб’ект і прадмет даследавання.** *Аб’ектам* даследавання з’яўляецца творчасць С.Грахоўскага, яе праблематыка, стыль і жанравая своеасаблівасць; *прадметам* – яго творчая эвалюцыя ў літаратурна-грамадскім кантэксце 30 – 90-х гадоў XX стагоддзя.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** У даследаванні выкарыстаны *канкрэтна-аналітычны, параўнальна-гістарычны, біяграфічны* (часткова) літаратуразнаўчыя метады.

Тэарэтыка-гістарычным падмуркам дысертацыі сталі працы аўтарытэтных айчынных і рускіх вучоных у галіне літаратуразнаўства, літаратурнай крытыкі, гісторыі, культуралогіі, філасофіі (М.М.Арочкі, В.А.Бечыка, Дз.Я.Бугаёва, П.К.Дзюбайлы, В.П.Жураўлёва, В.А.Каваленкі, У.М.Конана, В.П.Рагойшы, А.А.Лойкі, М.І.Мішчанчука, М.І.Мушынскага, А.С.Яскевіча, М.М.Бахціна, Ю.Б.Борава, В.У.Вінаградава, Г.Дз.Гачава, Дз.С.Ліхачова, А.А.Патабні, М.Б.Храпчанкі і інш.).

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Праца з’яўляецца комплекснай і канцэптуальнай распрацоўкай акрэсленай тэмы ў межах асобнага манаграфічнага даследавання. У ёй *упершыню*:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– ажыццёўлена сістэмнае даследаванне мастацкай творчасці С.Грахоўскага і яе эвалюцыі, спадчына пісьменніка пададзена як частка духоўнага жыцця краіны, што ў сваю чаргу садзейнічае аб'ектыўнаму асвятленню гісторыка-літаратурнага працэсу 30 – 90-х гадоў XX стагоддзя;

– праведзены цэласны аналіз праблемна-тэматычнага і мастацка-стылявога развіцця творчасці пісьменніка ў залежнасці ад успрыняцця ім канкрэтнага гістарычнага часу;

– устаноўлены тры этапы ідэйна-мастацкай эвалюцыі творчасці С.Грахоўскага (1926 – 1936 гг.; 1958 – першая палова 1980-х гг.; другая палова 1980-х – 1990-я гады);

– выяўлены і ахарактарызаваны жанравыя мадыфікацыі твораў пісьменніка на розных этапах яго літаратурнай дзейнасці;

– раскрыта адметнасць стылю С.Грахоўскага, асабліва чуйнага да змен у жыцці, "гучнага" і "ціхага", урачыста-адычнага і элегічна-задумлівага, з элементамі высмейвання, парадзіравання;

– уключаны ў літаратуразнаўчы ўжытак інтэрв'ю дысертанткі з пісьменнікам (дадатак 1); падаюцца табліцы (дадаткі 2 – 3), у якіх наглядна паўстае мастацкае ўдасканаленне паэтычных тэкстаў аўтарам на працягу яго творчага жыцця.

**Практычная каштоўнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў пры распрацоўцы курса лекцый па гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя, падрыхтоўцы спецсемінараў па сучаснай паэзіі і па творчасці С.Грахоўскага; матэрыялы даследавання таксама будуць карысныя для настаўнікаў беларускай літаратуры і вучняў сярэдніх і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў пры вывучэнні аглядавых тэм па гісторыі літаратуры (другая палова XX стагоддзя). Асноўныя палажэнні прадстаўленай да абароны працы апрабіраваны яе аўтарам у часе правядзення лекцыйных і практычных заняткаў па гісторыі беларускай літаратуры XX ст. на факультэце славянскай філалогіі УА "МДУ імя А.А. Куляшова".

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Формы лірычнага выяўлення С.Грахоўскім рэчаіснасці 20 – 30-х гадоў абумоўлены складанасцю развіцця тагачаснага грамадства, адметнасцямі літаратурнага працэсу: пазіраецца крыху наіўнае ўспрыняцце лірычным героем свету, спалучэнне радасных, жыццесцвярджальных матываў з "голай" рыторыкай, а таксама дакументальнасцю, якую аўтар спрабуе ўзняць на вышыню мастацкага абагульнення. Ранняя лірыка С.Грахоўскага напоўнена духам "маладнякізму" са спробамі індывідуальнага асэнсавання рэчаіснасці.

2. Паэзія С.Грахоўскага канца 50-х – першай паловы 80-х гадоў прасякнута вострым адчуваннем грамадзянскага, сацыяльнага пафасу гэтага часу. Яе змест залежыць ад ўспрыняцця свету, часу, жыцця, успрыняцця актыўнага, лірычна ўсхваляванага, што вызначае выбар слоў, рух думкі, рытміку, жанравую спецыфіку твораў: ад публіцыстычных вершаў-рэпартажаў, вершаў-адозваў, замалёвак мастак ідзе да глыбока лірычных вершаў-роздумаў, маналогаў, споведзей.

3. У 70 – 90-я гады тэма памяці ў лірыцы С.Грахоўскага становіцца вядучай. Памяць выступае як магутны сродак рэтраспектыўнага асэнсавання часу і жыцця,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ва ўсёй паўнаце праяўляецца памяць аб дзіцячых і юнацкіх гадах, аб першым каханні, аб жахлівых сталінскіх рэпрэсіях, аб Вялікай Айчыннай вайне, відавочна характэрнае паяднанне памяці пісьменніка, памяці грамадзяніна з гістарычнай памяццю Радзімы.

Характэрныя асаблівасці прозы С.Грахоўскага адзначанага перыяду – аналітычнасць, гуманістычнае асэнсаванне лёсу чалавека, імкненне да паглыбленага псіхалагізму, да аб'ектыўнасці, дакладнасці, да грунтоўнага даследавання духоўнага свету герояў, вытокаў іх учынкаў і здзяйсненняў.

4. Асноўныя ідэйна-эстэтычныя арыенціры С.Грахоўскага канца 80 – 90-х гадоў – гуманізм і дэмакратызм, імкненне адпавядаць патрэбам часу і чалавека, народная, хрысціянская мараль. У перапрацаваных, адноўленых і новых творах яднаюцца асабістае і агульначалавечае, эгалагічнае і медытатыўнае, публіцыстычнае і элегічнае.

5. Традыцыйныя для беларускай літаратуры тэмы Радзімы і прыроды распрацоўваюцца С.Грахоўскім у цеснай повязі з экалагічнымі і эстэтычнымі запатрабаваннямі часу. Магчымасць дасягнення гармоніі ва ўзаемаадносінах сучаснага грамадства з навакольным светам паэт звязвае з вырашэннем дзвюх першачарговых задач: глыбокае пазнанне людзьмі прыроды і выхаванне ў сучасніку пачуцця высокай адказнасці за яе лёс. Аб'ёмны і шматмерны пейзаж нараджаецца ў вершах паэта ў выніку ўдалага выкарыстання ім асацыятыўных вобразаў, багатай палітры гукаў і фарбаў, дасягнення рытміка-інтанацыйнай гармоніі, моўнай пластыкі, сюжэтнай і жанравай разнастайнасці.

6. С.Грахоўскі адным з першых у беларускай літаратуры звярнуўся да выкрыцця арганізацыйнай і маральнай сутнасці гулагаўскай сістэмы, імкнуўся максімальна наблізіць мастацкае адлюстраванне да рэальных падзей. У аўтабіяграфічнай аповесці "Зона маўчання" пісьменнік вырашае пытанне аб уздзеянні лагера на душу чалавека і прыходзіць да высновы, што ГУЛАГ як адзін з механізмаў палітычнай сістэмы не здолеў канчаткова знішчыць Веру, Спагаду, Дабро, хрысціянскія маральныя якасці, больш трывалыя ў параўнанні з каштоўнасцямі дзяржаўнай, турэмнай і лагернай маралі.

**Асабісты ўклад прэтэндэнта.** Дысертацыя і артыкулы, у якіх апублікаваны яе вынікі, напісаны без сааўтараў і адлюстроўваюць асабісты ўклад суіскальніка ў даследаванне літаратурнага працэсу XX стагоддзя.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Матэрыялы дысертацыі абмяркоўваліся на пасяджэнні кафедры беларускай літаратуры Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка" (24.06.2002 г., 30.06.2003 г.).

Большасць ідэй і вывадаў раскрывалася ў публічных паведамленнях, на лекцыях у студэнцкай аўдыторыі. Вынікі, атрыманыя ў працэсе даследавання, вызначылі змест дакладаў дысертанта на васьмі канферэнцыях: 1). Навуковая канферэнцыя маладых вучоных, аспірантаў і суіскальнікаў. Магілёў, 10 – 11 сакав. 1997 г.; 2). Каласавіны: Навуковая канферэнцыя. Мінск, 3 – 4 лістап. 1997 г.; 3). Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Канцэптуальныя пытанні развіцця мовы, літаратуры і мастацтва ў святле адраджэння культуры і духоўнасці беларускага народа". Мазыр, 23 – 24 красав. 1998 г.; 4). Рэспубліканская навуковая канферэнцыя

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"Акрыленыя словам", прысвечаная памяці Я.К.Усікава і В.І.Аграшкевіча. Магілёў, 9 снеж. 1999 г.; 5). Куляшоўскія чытанні: Навукова-практычная канферэнцыя "Творчество А.Кулешова и историко-культурный процесс". Магілёў, 7 студз. 2001 г.; 6). Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Проблемы истории и культуры Верхнего Поднепровья". Магілёў, 25 – 26 кастр. 2001 г.; 7). Куляшоўскія чытанні: Міжнародная навуковая канферэнцыя "Творчасць А.А.Куляшова і адукацыйна-асветніцкія праблемы сучаснасці". Магілёў, 6 – 7 лют. 2002 г.; 8). Куляшоўскія чытанні: Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю МДУ імя А.А.Куляшова. Магілёў, 11-12 снеж. 2003 г.

**Апублікаванасць вынікаў даследавання.** Асноўны змест працы выкладзены ў 14 публікацыях: 6 артыкулах, змешчаных у навуковых часопісах і зборніках, 8 матэрыялах выступленняў на канферэнцыях. Агульная колькасць старонак апублікаваных матэрыялаў – 67. Спіс публікацый даецца ў канцы аўтарэферата.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, двух раздзелаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц (282 пазіцыі) і трох дадаткаў. Асноўны матэрыял дысертацыі займае 99 старонак, са спісам літаратуры і дадаткамі – 168.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах** абгрунтоўваецца актуальнасць дысертацыйнай тэмы, фармулююцца яе мэты і задачы, падкрэсліваецца ступень даследаванасці абранай праблемы і навізна праведзенай працы, вызначаецца метадалогія навуковых пошукаў.

Звяртаецца ўвага на першыя водгукі ў друку, якія з'яўляліся адразу пасля выхаду першага зборніка вершаў паэта "Дзень нараджэння" (1958), а таксама напрыканцы 70 – 80-х гадоў[4]. Большасць рэцэнзій і артыкулаў гэтага часу, прысвечаных творчасці пісьменніка, носяць агульны характар, у іх з рознай ступенню дакладнасці даследчыкі імкнуцца прасачыць развіццё пэўных тэм, ідэй, матываў у яго творчасці ў цэлым. Структурныя межы артыкулаў і рэцэнзій, аднак, не дазваляюць ахарактарызаваць творчасць паэта цэласна, у адзінстве і ўзаемасувязі яе асобных частак.

У канцы 80-х – пачатку 90-х гадоў крытыка канстатавала нараджэнне новага, паглыблена-псіхалагічнага адлюстравання рэчаіснасці пісьменнікам, узмацненне яго філасофска-эстэтычнага пошуку. Асабліва праявілася гэта ў публікацыях М.Арочкі, Л.Ламекі, Л.Гарэлік, А.Марціновіча, М.Мішчанчука, А.Рагулі, Л.Савік[5]. З'явілася і першая абагульняючая праца пра творчасць С.Грахоўскага – манаграфічны раздзел Л.Гарэлік у акадэмічнай "Гісторыі беларускай літаратуры XX ст." (2001г.).

Перспектыўныя назіранні і вывады крытыкаў 70 – 90-х гадоў сталі навуковымі

---

[4]Найбольшую цікавасць, на нашу думку, выклікаюць наступныя даследаванні: Лойка А. Пошукі паэзіі // Полымя. – 1958. – № 10. – С. 189 – 191; Бугаёў Д. Паэзія С.Грахоўскага // Полымя. – 1963. – № 9. – С. 177 – 180; Марціновіч А. Маладосць паэтычнай сталасці // Полымя. – 1979. – № 11. – С. 247 – 250; Гніламёдаў У. Лірычны дзённік паэта // Літ. і мастацтва. – 1985. – 2 жн. – С. 6; Мішчанчук М.І. Дабрата чалавеку патрэбна // Мішчанчук М.І. Беларуская літаратура на сучасным этапе: Літ.-крыт. арт. – Мінск: Выш. школа, 1983. – С. 105 – 121.

[5] Арочка М. Уваскрослыя постаці // Полымя. – 1992. – № 4. – С. 235 – 248; Гарэлік Л. Пропаведзь дабра // Полымя. – 1994. – № 2. – С. 228 – 240; Ламека Л. Асвечанае трагедыяй // Полымя. – 1991. – № 3. – С. 248 – 250; Рагуля А. Са шляхоў крывава-дымных... // Літ. і мастацтва. – 1990. – 4 верас. – С. 6 – 7; Савік Л. Святых пакутнікаў імёны // Звязда. – 1992. – 18 жн. – С. 4; Марціновіч А. У слове – боль душы // Полымя. – 1997. – № 6. – С. 312 – 316.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

крыніцамі, што даюць імпульс для цэласнага і канцэптуальнага аналізу мастацкіх набыткаў аўтара, дапамагаюць вызначыць яго уклад у беларускую літаратуру.

У першы раздзел – **"Ідэйна-эстэтычныя пошукі Сяргея Грахоўскага: ад юнацтва да творчай сталасці"** – увайшлі чатыры параграфы: "«Маладнякізм» і станаўленне творчай асобы С.Грахоўскага", "Час і чалавек у паэзіі С.Грахоўскага канца 1950-х – першай паловы 1980-х гадоў", "Матыў памяці як аснова лірыка філасофскіх медытацый у паэзіі", "Маральна-этычная праблематыка прозы С.Грахоўскага ("Які вялікі дзень", "Сустрэча з самім сабою").

У гэтым раздзеле прасочваецца працэс станаўлення індывідуальнага стылю С.Грахоўскага, выпрацоўкі яго светапогляднай пазіцыі. Даследуюцца спецыфіка характару лірычнага героя, эвалюцыя рытмамелодыкі, фарміраванне жанраў паэтычных і празаічных твораў.

Прааналізаваны раннія тэксты С.Грахоўскага ў кантэксце лірыкі паэтаў-маладнякоўцаў (П.Труса, У.Хадыкі, В.Маракова, Т.Кляшторнага і інш.)[6]. Дысертант адзначае: паводле ідэйнай накіраванасці, асноўнага зместу, агульнага эмацыянальнага ладу ранняя лірыка С.Грахоўскага набліжаецца да творчасці маладнякоўцаў сваёй тэматыкай, вобразнасцю, падыходам да адлюстравання жыццёвых з'яў. Пачаткоўцу яшчэ бракуе свайго паэтычнага зроку, свайго стылю ("Героі перамог", "Зьмена Ільічу", "Ільнаводу", "Так пачнецца вясна").

Даследчык заўважае, што цэнтральны вобраз-сімвал паэзіі С.Грахоўскага канца 20-х – першай паловы 30-х гадоў – вобраз вясны, традыцыйна звязаны з матывамі адраджэння Беларусі. Напрыклад, у вершах "Так пачнецца вясна", "Чацвёртая вясна" аўтар у пэўнай ступені дасягае сінтэзу агульнага і прыватнага, робіць сацыяльна значнае асабістым перажываннем. Аднак такіх вершаў у творчасці С.Грахоўскага канца 20-х – пачатку 30-х гадоў было няшмат: ранняй лірыцы не ставала праблемнасці, асноўныя яе рысы – сэнсавая прастата і шчырасць, якія знаходзяць сваё ўвасабленне ў "апавядальнай" форме верша. Праступае нават крыху знарочыстая "спрошчанасць" структуры страфы, якая складаецца з інфармацыйных сказаў, без інверсій, без выдзялення апорных слоў, з небагатай паэтычнай лексікай ("Ільнаводу", "Так пачнецца вясна").

С.Грахоўскі, як і яго сучаснікі, зазначаецца ў дысертацыі, аддае перавагу вершам на вытворчую тэматыку ("Гідрастанцыя", "Пачынаецца дзень У СЕМ... ", "Галіевы ланцужкі", "Героі перамог"). Мажорнасць, жыццярадаснасць у гэтых творах спалучаліся з рытарычнасцю і параднасцю, абстрактнай плакатнасцю, велігурыстасцю.

Аднак, нягледзячы на рыторыку і ілюстрацыйнасць, даказваецца ў дысертацыйным даследаванні, раннія творы С.Грахоўскага спрыяюць асэнсаванню і разуменню сутнасці часу і рамантыкі 20-х – пачатку 30-х гадоў, яны ў пэўнай меры даюць частковае ўяўленне пра даваенную эпоху, паказваюць веліч задумак будаўнікоў новага ладу жыцця, дапамагаюць зразумець пачуцці тагачаснага маладога пакалення.

[6] Першы друкаваны твор паэта – верш "Зьмена Ільічу" – быў змешчаны ў часопісе "Беларускі піянер" (1926 г., №7). З таго часу вершы маладога паэта часта з'яўляюцца на старонках рэспубліканскіх і абласных газет ("Звязда", "Чырвоная змена", "Камуніст", "Калгаснік Беларусі", "Камунар Магілёўшчыны"), часопісаў ("Маладняк," "Вясна", "Чырвоная Беларусь", "Работніца і калгасніца Беларусі", "Беларускі піянер").

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

З 1960-х гадоў, паводле назіранняў даследчыка, пачынаецца новы этап творчай дзейнасці С.Грахоўскага: узмацняюцца духоўны пошук, філасафічнасць, пачуццё Часу і Гісторыі. Аўтару дысертацыі было важным асэнсаваць той факт, што пасля вяртання з лагера С.Грахоўскі, як і іншыя беларускія пісьменнікі (Л.Геніюш, А.Звонак, П.Пруднікаў, М.Хведаровіч), не адразу загаварыў пра перажытае. І не толькі таму, што гэта было забароненай тэмай у друку, але і, як заўважае Л.Гарэлік, "перасцярогай, своеасаблівай псіхалагічнай рэакцыяй на нечалавечае паднявольнае жыццё"[7].

Зборнік "Дзень нараджэння" (1958)[8] насычаны мяккім лірызмам, выразнасцю ўражанняў. І ўсё ж у ім пераважалі апісальнасць, наіўная прастата асацыяцый, танальнасць од. Паэт часам бывае "звыш дэкларацыйным", многія вершы ("Дыплом на годнасць чалавека", "Дарога да шчасця", "Ноч над Мінскам", "Нёман") нагадваюць "празаічны гладкапіс", пазбаўлены кампазіцыйнага стрыжня, празмерна расцягнутыя і шматслоўныя. Некаторыя творы перапоўнены вобразамі-штампамі, агульнавядомымі паралелямі, у іх выкарыстоўваюцца пашыраныя ў той час выяўленчыя сродкі ("Айчына", "На Волзе", "Дакор сабе"). Пануюць ідэалагізацыя, упрыгожванне жыцця, суцэльныя аздобы.

Былі і шчаслівыя набыткі, сярод іх – навелістычны верш "На таежнай дарозе". На глухой таежнай дарозе згубілася невялічкая хатка, у ёй ніхто не жыве, толькі ў сцюжу ці буран сюды заглядваюць падарожнікі, каб адпачыць і пагрэцца. Але ў хатцы заўсёды гарыць агеньчык, свецяцца два акенцы, заўсёды знойдзецца акрайчык хлеба. Герой верша клапоціцца, каб не згас агеньчык і ў хаце было цяпло: "*Вось і я, абагрэўшыся, дровы прынёс. // Хлеб пакінуў, крыху пастаяў ля парога.* <...>"[9].

Гуманістычным пафасам прасякнуты вершы "Багацце", "Патрэбен чалавеку чалавек", "Я цябе прыгадаў" і інш. Гуманізм паэта, дзейсны, актыўны, наступальны, выяўляецца, па сутнасці, амаль у кожным творы. Настойлівае сцвярджэнне духоўна напоўненага жыцця ("Шукаць, знаходзіць, быць няспынным, // Не проста існаваць, а жыць") увесь час дапаўняецца душэўнай чуласцю, спагадай.

Такім чынам, ужо ў першым зборніку С.Грахоўскага выявіліся тэндэнцыі, якія ў далейшым вызначаць своеасаблівасць яго творчай манеры: уменне глыбока пранікаць у псіхалогію чалавека, паэтычна выяўляць сутнасць з'яў, пільна прыглядацца да дэталяў і рэалій навакольнага свету. Зборнік напоўнены настойлівым імкненнем аўтара выпрацаваць сваю канцэпцыю часу, сцвердзіць свой погляд на свет, знайсці сваю тэму.

Дысертант адзначае, што канец 60-х – 70-я гады былі вельмі плённыя ў творчым жыцці С.Грахоўскага. Адна за адной выдаюцца кнігі вершаў і прозы: "Ад вясны да вясны" (1959), "Чаканне" (1960), "Сёння і заўтра" (1961), "Табе зайздросціць сонца" (1963), "Памяць" (1965), "Які вялікі дзень" (1966), "Гарыць касцёр" (1966), "Тры вымярэнні" (1967), "Рудабельская рэспубліка" (1968), "Паэма дарог" (1970), "Агеньчык у акне" (1972), "Гарачае лета" (1974), "Ранні снег" (1975). Яны вызначаюцца разнастайнасцю тэматыкі, надзённасцю, лірызмам. Зразумела, і

---

[7] Гарэлік Л. Пропаведзь дабра // Полымя. – 1994. – № 2. – С. 232.

[8] Першы зборнік мог бы выйсці з друку значна раней. Яшчэ ў пачатку 30-х гадоў паэтам быў падрыхтаваны вершаваны зборнік (палітрэдактар В.Барысенка), аднак А.Кучар, які рэцэнзаваў кнігу, да друку яе не дапусціў (з гутаркі дысертанта з С.І.Грахоўскім, запіс зроблены 28.10.97 г.).

[9] Грахоўскі С. Дзень нараджэння: Вершы. – Мінск: Дзярж. выд.-ва БССР, 1958. – С. 6.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тэматыка вершаў, і іх жанравыя мадыфікацыі (вершы-звароты, вершы-апавяданні, вершы-развагі) не былі яшчэ настолькі разнастайнымі, як, напрыклад, у паэзіі А.Куляшова, П.Панчанкі, Максіма Танка. Паэт яшчэ не прыйшоў да сваёй спавядальнай формы, аднак адчуваецца эвалюцыя лірычнага героя, які аб'ёмна ўспрымае свет, сваю сувязь з Радзімай ("Табе зайздросціць сонца", "Каляндар", "Летуценнік"). Узбагачэнне паэзіі С.Грахоўскага новым зместам, новымі матывамі, настроямі, пашырэнне ідэйна-творчых даляглядаў вяло да пэўных зрухаў і ў вобразным ладзе, рытміцы і інтанацыйным гучанні вершаў. Адмаўляючыся ад гучных і малазмястоўных вобразаў, паэт імкнуўся дасягнуць натуральнасці, дакладнасці і прастаты. Але ж іншы раз яшчэ сустракаліся вершы-дэкларацыі ("Сляды на зямлі", "Дні", "Ісціна", "Зямлянін я", "Многа помнім, болей забываем..."), у якіх "агульнае перарастае ў агульшчыну, у набор даўно ўжо вядомых ісцін"[10]. Не адразу ў цэнтры ўвагі паэта стаў звычайны чалавек з яго слабасцямі і перажываннямі, а не "хадульны герой", як гэта было раней. Адзначаецца, што многія недахопы творчасці пісьменніка ішлі і ад штучнай перапыненасці літаратурнага працэсу, што не спрыяла творчаму ўдасканаленню, развіццю майстэрства.

Заслугоўвае ўвагі той факт, што многія вершы 60 – 70-х гг. напісаны ў форме звароту да блізкага сябра ("Твой голас", "Прызнанне", "Прыгожыя рукі", "Бабіна лета", "Табе зайздросціць сонца", "Ты, мабыць, добра ведаеш сама" і інш.). Больш за тое, паэт увесь час імкнецца да пашырэння кола адрасатаў сваіх твораў, да абагульненняў у выяўленні лірычнага пачуцця.

Па-новаму, зазначае аўтар даследавання, раскрываецца тэма працы. Калі ў вершаваных цыклах "Полацкі сшытак" (зб. "Чаканне"), "Нафтаград" (зб. "Табе зайздросціць сонца") паэт, абапіраючыся на канкрэтныя факты, дае "замалёўкі з натуры", захапляецца бытам працаўнікоў, іх справамі, то ў пазнейшых сваіх творах ("Сейбіт", "Зямля", "Вышэйшы чын") "настройваецца на больш элегічны лад, на роздум пра высокую годнасць чалавека-працаўніка і бессмяротнасць яго спраў"[11]. Паглыбляецца само паняцце "працы", яна разглядаецца мастаком у больш шырокім разуменні – як аснова чалавечага жыцця ўвогуле, мера чалавечай годнасці і вартасці.

Паэт імкнецца пазбавіцца тэматычнай і жанрава-стылявой звужанасці, пераадольвае натуралістычную апісальнасць, фактаграфічнасць, цікавіцца філасофскімі пытаннямі. Сведчанне таму – зборнікі "Паэма дарог" (1970), "Зазімак" (1976), "Зачараванасць" (1978). Вызначальнымі рысамі характару лірычнага героя становяцца высокая гуманнасць, грамадзянскасць і пошук вышэйшых жыццёвых каштоўнасцей. Вершы пазначаны ўсхваляванасцю, шчырасцю эмоцый і самапаглыбленнем. Не ўсе творы напісаны на такім высокім узроўні, але аўтар да яго, безумоўна, імкнецца.

Дысертант адзначае, што С.Грахоўскі ўсё менш увагі засяроджвае на знешнім факце, апісанні, а больш арыентуецца на асэнсаванне ўнутранай сутнасці з'яў. Знешняе ўсё часцей уключаецца ў арбіту роздумаў паэта над пытаннямі жыцця і смерці, шчасця, кахання, узаемаадносін чалавека з грамадствам і прыродай. Высокага

[10] Мішчанчук М.І. Дабрата чалавеку патрэбна // Мішчанчук М.І. Беларуская літаратура на сучасным этапе: Літ.-крыт. арт. – Мінск: Выш. школа, 1983. – С. 111.
[11] Там жа. – С. 116.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паэтычнага майстэрства С.Грахоўскі дасягае ў зборніках "Зазімак", "Зачараванасць", "Асеннія гнёзды". Выключнае майстэрства праявілася ў інтымных, пейзажных вершах ("Зачараванасць", "Мне сняцца суніцы", "У той далёкай маладосці" і інш.).

Наватарскае раскрыццё ў паэзіі С.Грахоўскага набывае тэма Радзімы. Сэрца паэта неабыякавае да тых мясцін, дзе туліцца *"адзіны" і "самы родны кут", "выток усіх вытокаў"* ("Роднае", "Кліча вясна", "Бацькаўшчына"). Лірычнае "я" паэта не замыкаецца ў сабе: боль і радасць яго душы адкрытыя ўсяму свету. Ад многіх вершаў вее цішынёй, спакоем, пра самае дарагое і блізкае паэт змог сказаць нягучна і пранікліва ("Пасля грому", "Рабінавая цішыня", "Зазімак", "Сум па снезе").

Дысертант звяртае ўвагу на вершы, у якіх паэт разважае пра сваю творчасць, пра свае мастацкія задумы і здзяйсненні ("Паэт", "Звяно", "Свет паэта", "Калі ты друг", "Суцяшэнне", "Мне крытыкі гавораць"). Пісьменнік успрымае сябе як вельмі сціплае звяно ў ланцугу літаратурных пакаленняў.

У паэта, адзначае аўтар навуковага даследавання, выпрацавалася свае рэчыўнае поле, куды ўключаюцца прадметы, якія набылі своеасаблівы сэнс ("Коціцца званочак", "Колішнія рынкі"), паэтычны арэол: *"Пахмурны дзень. І не праб'ецца сонца. // Калышацца рабіна на буі, // На пераспелай пурпуровай гронцы // Гайдаюцца сівыя вераб'і"*, *"Якая цішыня на белым свеце // І ачышчэнне неспакойных душ"*[12].

С.Грахоўскі малюе свой паэтычны свет, які цалкам не супадае з рэальным навакольным светам. І сапраўды, хіба ж "рака кужэльны ток снуе <...>, на атаве палотны сцеле тонкія свае"? Прадметы і з'явы набываюць эстэтычную функцыю, духоўнае выяўленне: *"рабіна свеціць", "рабіну не паранъ"*. З ёю звязана думка пра шчодрую дабрату, у якой аснова і шчасця, і спакою на зямлі.

З'ява прыроды падаецца такою, каб яна выклікала адпаведны настрой, пэўнае пачуццё. Нібы з лермантаўскай паэзіі або з кнігі В.Катаева "Белеет парус одинокий" прыйшоў да С.Грахоўскага вобраз ветразя, які ў беларускага паэта набыў іншае, па-нацыянальнаму спецыфічнае выяўленне, увайшоў у кантэкст нацыянальнай культуры, хаця, здавалася б, гаворка ідзе не пра Беларусь, а пра Прыбалтыку, дзе на "беразе зары чырвоны пясок, у грудзі хваляй вецер б'е". <...> *// Але далекі хісткі ветразь, то знікне, то далей плыве"*[13]. Так, адчуваецца яўная алюзія на творы М.Лермантава, але ўжо з іншай "арыенціроўкай": *"Я ім даўно зачараваны, не адарваць ніяк вачэй... // А з хмары, як з глыбокай раны, зара барвовая цячэ"* [14]. Ветразь рускага паэта просіць буры, а ў беларускага *"кліча у ранішнюю даль"*. Гэты ўяўны вобраз існуе толькі ў дадзеным кантэксце (выдалены з кантэксту, ён набывае іншы сэнс).

Даследчык адзначае, што з 60-х гадоў тэма памяці становіцца лейтматыўнай, яна цесна звязана з праблемамі рэтраспектыўнага асвятлення гісторыі, становіцца прыкметай грамадскага і мастацкага асэнсавання часу. Тэма памяці ўжо з першых вершаваных зборнікаў – "Дзень нараджэння", "Чаканне", "Табе зайдросціць сонца" – становіцца адным са спосабаў адлюстравання навакольнага свету. Падаюцца ўспаміны аб дзіцячых і юнацкіх гадах, першым каханні, аб Вялікай

[12] Грахоўскі С. Зачараванасць: Вершы і паэмы. – Мінск: Маст. літ., 1978. – С. 62.
[13] Там жа. – С. 56.
[14] Там жа. – С. 56.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Айчыннай вайне, страшных часах рэпрэсій.

У вершах на тэму Вялікай Айчыннай вайны паэт пазбягае крывавых сцэн, жахаў баёў, вайна паўстае як бы апасродкавана – праз пакалечаныя лёсы, не заўсёды бачныя душэўныя раны. Як і А.Пысін, С.Грахоўскі нрапаноўвае чытачу адшукаць новы, паглыблены сэнс перажытага на вайне; ён не прымае павярхоўнае адлюстраванне гераізму, адмаўляецца ад гучных, рытарычных вершаў пра вайну ("Вечны салдат", "Ваенныя фільмы", "Боль", паэма "Бяссмертнікі").

Дакументалізмам, нявыдуманай праўдзівасцю ўражваюць творы пра асабіста перажытае ў сталінскіх лагерах ("Кругі надзеі", 1985; "Верую", 1987; "І радасць і боль", 1988; "Споведзь", 1990). Многія лічылі С.Грахоўскага "нягучным" паэтам, з невыразнай грамадзянскай пазіцыяй. У гэтых творах паэт паўстае іншым – суровым, часам жорсткім, яго чалавечая і грамадзянская пазіцыя адназначная: "*Без праўды можна існаваць, // А жыць без праўды немагчыма*" ("Немагчыма").

У шматлікіх вершах С.Грахоўскі выступае як публіцыст ("Балючае", "Тармазы", "Вечная памяць", "А ён яшчэ жывы", "Гісторыя"). Публіцыстычная завостранасць голасу С.Грахоўскага абумовіла распрацоўку новых паэтычных форм, жанравых мадыфікацый: верш-зварот, верш-разважанне з выразнымі адзнакамі медытатыўнай элегіі ("Размова з А.Пысіным", "Ноч на адзіноце", "Пагавару з сабой"). Душа паэта раскрываецца ў форме разважання яго з самім сабой, часам такія разважанні спалучаюцца са зваротамі да рэцыпіента ("Ціхія пенсіянеры", "Майму суддзі" і інш.).

Значная ўвага ў даследаванні надаецца тэкстуальнаму аналізу вершаў "Гісторыя", "Спаленыя кнігі", "Страчаная маладосць", "Ціхія пенсіянеры", Адзначаецца, што страшнейшага душэўнага стану, чым заспакоенасць, для мастака слова няма, у гэтым яго духоўная смерць. Паэт знаходзіць у сабе сілы прызнаць, што часам па сваёй віне ці па аб'ектыўных прычынах вымушаны быў ісці на кампраміс з сумленнем, якое абуджае пачуццё віны перад загінуўшымі, таму абавязвае расказаць праўду пра трагічныя часы ("Вечная памяць", "Ахвяры", "Даруйце", "Згаслыя свечкі"), выступае ў якасці "справядлівага суддзі". І суд сумлення самы цяжкі для паэта: "*Я распінаю кожны дзень сябе, // Гатовы пасадзіць душу за краты, // Бо памяць неадольная дзяўбе, // Што сам перад сабою вінаваты*" ("Калі б перапісаць на чыставік")[15].

Вяршыняй у творчым развіцці паэта паўстала паэма "Балючая памяць" (1980 – 1987), якую М.Арочка вызначае як "своеасаблівы паэтычны аналаг аповесці "Адзін дзень Івана Дзянісавіча" А.Салжаніцына"[16].

Даследчык адзначае, што калі ў адных творах паэт успамінае перажытае гнеўна, з запалам ("Ад "вінаватых" без віны", "Вечная памяць", "Майму суддзю", "А ён яшчэ жывы" і іншых), то ў другіх ("Балючае", "Стары млын", "Даруйце", "Споведзь", "Сатлелыя лісты") боль і горыч мінулых гадоў як бы суцішаюцца радасцю ад усведамлення таго, што ўдалося выжыць, агараць бяду ("Купалаўцы", "Нечаканасць", "Трэба жыць"). Вершы апошніх гадоў ("Настрой", "Малітва", "Равесніца", "Незваротнае", "Позняя восень") сведчаць аб маральна-этычных пошуках паэта, аб

---

[15] Грахоўскі С. Выбраныя творы: У 2 т. – Мінск: Маст. літ., 1994. – Т. 1: Вячэрні звон: Вершы, паэмы. – С. 245.
[16] Арочка М. Уваскрослыя постаці // Полымя. – 1992. – № 4. – С. 242.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

распрацоўцы праблемы гуманізму, гістарычнай памяці, "бо ўспрыняцце часу немагчыма даследаваць без уліку памяці, якая арганічна ўключана ў працэс узнаўлення часу"[17].

У дысертацыі разглядаюцца і празаічныя творы С.Грахоўскага. Аўтар аналізуе зборнікі апавяданняў "Які вялікі дзень" (1966), "Сустрэча з самім сабою" (1988). Адзначаны уплыў тэорыі бесканфліктнасці на яго прозу, праявы пасталінейнага дыдактызму, героі спрашчаюцца, схематызуюцца, рэчаіснасць упрыгожваецца ("Які вялікі дзень", "Дзе ўзыходзіць сонца", "Ну і ашуканцы", "Так і было" "Любою цаною", "Сувеніры"). З ростам пісьменніцкага майстэрства пры наступных перавыданнях апавяданні дапрацоўваліся, шліфаваліся: удасканальваўся стыль, здымаліся лішнія дэталі, дадаваліся штрыхі, якія больш поўна раскрывалі характар герояў.

Але ж пераважная большасць апавяданняў С.Грахоўскага (асабліва са зборніка "Сустрэча з самім сабою") пазначана глыбокім псіхалагізмам, у іх пафас гуманізму не дэкларуецца, а вынікае з самой карціны, з развіцця сюжэта і лірычнага пачуцця ("Зялёны агеньчык", "Варнак", "Зімовыя сны", "Галя Карэцкая", "Мальвы", "Рута", "А маці не спіць", "Сын"). Яны вызначаюцца займальнасцю сюжэта, кампазіцыйнай завершанасцю, цікавымі характарамі, роздумам над складанымі маральна-этычнымі праблемамі сучаснасці, якія часцей за ўсё раскрываюцца на матэрыяле вясковага жыцця. Дысертант звяртае ўвагу на ідэйна-мастацкую эвалюцыю апавяданняў С.Грахоўскага – ад нарысаў пра гераізм працаўнікоў, ушанаваных дзяржавай, да твораў пра людзей пакрыўджаных, занядбаных, ад павярхоўнай ілюстрацыйнасці да глыбокага псіхалагізму.

Такім чынам, канец 50-х – першая палова 80-х гадоў – значны і важны этап у творчым развіцці С.Грахоўскага. Яго лірыка прасякнута разуменнем часу, мастак востра адчувае гістарычную эпоху, яе змест, праблематыку. У гэты перыяд былі створаны вершы глыбока лірычнага гучання. Прытым жанравая своеасаблівасць лірыкі паэта залежала ад яго канцэпцыі часу, актыўнасць лірычнага хвалявання узмацняла дзейснасць паэтычнага слова, вызначаючы развіццё верша: паэт ішоў ад публіцыстычных вершаў-маналогаў да глыбока лірычных вершаў-роздумаў, вершаў-споведзей.

Раздзел другі **"Творчасць С.Грахоўскага канца 1980-х – 1990-х гадоў: ідэйна-тэматычны і вобразны аспекты"** – складаецца з трох параграфаў: "Паэтычныя пошукі С.Грахоўскага", "Маральна-філасофская інтэрпрэтацыя праблемы "чалавек і прырода" ў паэзіі С.Грахоўскага", "Спавядальная проза С.Грахоўскага".

Адзначаецца, што з канца 80-х гадоў пачынаецца новы этап у творчым развіцці С.Грахоўскага. Даследчыку важна было падкрэсліць, што паэт па-новаму асэнсоўвае складаны ўнутраны свет чалавека (зб. "На апошняй вярсце", 1993; "Недапісаная кніга", 1996; вершы, змешчаныя ў перыядычных выданнях[18]). У яго ўзмацняюцца адраджэнскія матывы ("Слова", "Мой народ"), ён, як і П.Панчанка, К.Кірэнка, Р.Барадулін, Н.Гілевіч, А.Лойка і інш., выразна адлюстроўвае

---

[17] Чередниченко В.И. Типология временных отношений в лирике. – Тбилиси: Изд. Мецниэреба, 1986. – С. 140.

[18] Грахоўскі С. Вершы // Полымя. – 1997. – № 3 – С. 272 – 304; Грахоўскі С. Вершы // Полымя. – 1998 № 9 – С. 93 – 103; Грахоўскі С. Вершы // Полымя. – 1999. – № 8. – С. 80 – 87. Грахоўскі С. Вершы // Беларусь. – 1998. – № 9 – С. 45; Грахоўскі С. Вершы // Род. слова. – 1998. – № 9. – С. 180 – 184; Грахоўскі С. Вершы // Маладосць. – 1998. – № 8. – С. 151 – 160; Грахоўскі С. Вершы // Неман. – 1996. – № 3. – С. 3 – 5.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

складанасці і супярэчнасці "ліхога стагоддзя".

У шматлікіх творах паэт уздымаецца да філасофскага разумення псіхалогіі сучасніка, шукае ісціну праз аналіз падзей мінулага ("Спрадвеку добры мой народ", "Вячэрні звон"): "<...> *Патухлі свечкі і лампады, // Калі ў будзёнаўках чыны // Без жалю, веры і спагады // Дадолу кінулі званы <...>*" ("Вячэрні звон")[19]. Бог і Боскае ў душы чалавека – вось тое, што здольна перайначыць грамадскае жыццё, сцвярджае паэт. Верш заканчваецца, дарэчы, як і пачынаецца, радкамі элегічнымі, роздумнымі, якія сведчаць пра боль лірычнага героя, яго пакуты, гатоўнасць да самаачышчэння: "*<...> Як змрок нарэшце расступіўся, // Я трапіў у дзівосны сон // І, як даўней, перахрысціўся, // Пачуўшы зноў вячэрні звон*" ("Вячэрні звон")[20]. Чаргаванне ў творы публіцыстычнага пафасу і элегічнага настрою з'яўляецца характэрнай стылявай асаблівасцю ўсёй паэзіі С.Грахоўскага канца 80 – 90-х гадоў.

У жанравых адносінах зборнік вершаў "На апошняй вярсце" больш разнастайны, чым папярэднія. Тут пераважаюць лірычныя маналогі, вершы глыбока спавядальныя і элегічныя, у ім – споведзь лірычнага героя, які адчувае сябе няўтульна і адзінока ў гэтым неўладкаваным свеце ("Адзінота", "Асуджаны на мукі з нараджэння", "Прызнанне").

Дысертант адзначае, што для "Недапісанай кнігі" таксама характэрна ўвага да "экалогіі пачуццяў, экалогіі кахання". Паэт ставіць інтымны пачатак на першае месца. Вершы на тэму кахання разнастайныя і па форме, і па змесце, вызначаюцца глыбінёй падтэксту, выразнасцю псіхалагічнага малюнка, драматызмам. Часам умоўна-сімвалічны і рэальны планы пераплятаюцца, дапамагаючы перадаць стан душы лірычнага героя ("Каля вогнішча", "На шыбах – белыя лілеі", "На Пціч"). Гэта паэзія, напоўненая сумам па незваротным ("Дагарае леташняе лісце", "Позняя восень"). Аднак смутак у ёй "*светлы*", боль "*салодкі*" ("Светлы смутак", "Салодкі боль").

У дысертацыі даследуюцца новыя тэндэнцыі паэзіі С.Грахоўскага канца 80 – 90-х гадоў. Гэта перш за ўсё восеньскія матывы, звязаныя з падвядзеннем жыццёвых рахункаў "на апошняй вярсце", з усведамленнем сэнсу людскога існавання ("На самоце", "Позняя восень"). Творы напоўнены схаваным драматызмам ("Жуpавы", "Неюбілейны", "Адзінае жаданне", "Мае радкі", "Мара", "Казка жыцця", "Прычына"). Драматызацыя лірыкі знаходзіць не толькі змястоўнае, а і фармальнае выяўленне ў вершах-дыялогах ("Бежанцы", "Апошняя"), у гутарцы аўтара з самім сабою ("Хвіліна адчаю"). Сімволіка твораў набывае багаты філасофска-эстэтычны змест ("Над прорвай", "У сацлагеры", "Спруты", "Тупікі"). Пабольшваецца роля эпасу. Напрыклад, вершы "Век", "Змена – змене", "Вечныя" – гэта своеасаблівыя вершаваныя апавяданні, балючыя занатоўкі пра сённяшні час.

Пісьменніка цікавяць сітуацыі "памежжа", якія, на думку вядомых беларускіх літаратуразнаўцаў А.Бельскага, І.Чароты, М.Мішчанчука, з'яўляюцца характэрнымі для беларускага менталітэту ("На стыку смерці і жыцця"). Адзначаецца, што многія вершы зборніка змяшчаюць у сабе супрацьлеглыя сітуацыі, паняцці. Усё гэта прыводзіць да паяднання ў адным творы радаснага і сумнага настрою, апісальнасці і філасафічнасці, адзнак оды і элегіі ("Размова з помнікам", "Мой народ", "Літанне".

---

[19] Грахоўскі С. Выбраныя творы: У 2 т. – Мінск: Маст. літ., 1994. – Т. 1: Вячэрні звон: Вершы, паэмы. – С. 252.
[20] Там жа. – С. 252.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"Пад небам Беларусі"). Даследчык адзначае, што лірыка С.Грахоўскага канца 80 – 90-х гадоў набывае абвострана-публіцыстычнае гучанне.

Разам з тым, не страчваючы грамадзянскага пафасу, паэт усё глыбей адлюстроўвае супярэчлівы стан душы лірычнага героя: сумненні ў сабе, жаданне наладзіць новыя, невядомыя дасюль сувязі са светам, зразумець яго рух. Ускладненасць філасофска-эстэтычнага пошуку абвастрае паэтычную форму. У жанравай сістэме паэта ўсё большае месца займаюць лірычная мініяцюра, лірычны маналог, элегія, у якіх выражаецца глыбокі роздум мастака слова над праблемамі часу. Стыль робіцца сінтэтычным: у творах адначасова спалучаюцца публіцыстычнасць, іронія і філасофскі роздум над сэнсам жыцця, падсвечаны элегічным настроем.

У дысертацыйнай працы значная ўвага надаецца аналізу тэкстаў, у якіх найбольш ярка выяўляецца майстэрства Грахоўскага-пейзажыста ("Зачараванасць", "Рабінавая ноч", "Прадвесне", "Зімовы сум", "Люблю зямлю, што пахне лесам"). Вобразная паўнакроўнасць вершаў, шчодрасць гукаў, багацце сэнсавых асацыяцый, якія адпавядаюць бязмежнай фантазіі лірычнага героя, – з гэтага пачынаецца непаўторная арыгінальнасць пейзажаў С.Грахоўскага: *"Ударыць ноччу завіруха, // На пні сумёты намяце, // Ад сцюжы дуб застогне глуха, // І сціхне ўсё у немаце. <...>"* ("Зачараванасць")[21]. Паэт здольны імгненна сінтэзаваць разнастайныя ўражанні, спалучаць умоўнае з рэальным, знаходзячы кожны раз нязвыклы пункт гледжання на прадмет. Разам з тым дысертант адзначае, што прырода ў лірыцы С.Грахоўскага – гэта аб'ект і сузірання, і аналізу, даследавання, роздуму ("Мне сняцца суніцы", "Адзінота", "Маладзік", "Завіруха").

Асаблівую цікавасць, як лічыць даследчык, уяўляюць вершы, у якіх мастак слова закранае праблему адносін чалавека і прыроды ("Літасць", "Ласіны след", "Лясы, лясы...", "Пціч", "Райнісавы сосны"). У гэтых творах С.Грахоўскі разважае пра трывожныя з'явы жыцця, тыя страты, якія наносіць прыродзе чалавек, апантаны ідэямі пераўтварэння свету. Так, у вершы "Ласіны след" паказана мяжа, што падзяляе свет гарманічна ўладкаваны (свет прыроды) і свет бяздумна-рацыянальны (свет банальных уяўленняў чалавека пра жыццё і адносіны да гэтага жыцця). Твор гучыць як горкі боль страты зямной прыгажосці і як сур'ёзны папрок неабдуманым учынкам чалавека.

Прырода ў паэзіі С.Грахоўскага ачалавечана, надзелена здольнасцю адчуваць боль. Больш за тое, паэт імкнецца яго падкрэсліць, завастрыць, каб узмацніць увесь драматызм яго нявыказанасці, усю крыўду за тое, што чалавек не спяшаецца на дапамогу, а, наадварот, губіць прыроду ("Лясы, лясы...", "Пціч"). Вядомы французскі мастак Тэадор Русо гаварыў: "Калі можна яшчэ аспрэчваць, што дрэвы могуць думаць, то ўжо ў любым выпадку яны прымушаюць нас думаць"[22]. Пейзаж С. Грахоўскага прымушае нас думаць – у гэтым яго асноўная каштоўнасць. Паэт непадзельна ўспрымае паняцці "прырода" і "мараль". У бедах і ранах, нанесеных прыродзе, – вынік спажывецкіх, прагматычна-карыслівых адносін чалавека да прыроды.

Мастак слова не толькі разважае аб канфлікце паміж чалавекам і прыродай, а і настойліва шукае шляхоў яго вырашэння. Падкрэсліваецца неабходнасць пераходу

---

[21] Грахоўскі С. Выбраныя творы: У 2 т. – Мінск: Маст. літ., 1983. – Т. 1: Вершы 1929 – 1977 гг. – С. 333.
[22] Галанов Б.Е. Живопись словом. Портрет. Пейзаж. Вещь. – М.: Сов. писатель, 1974. – С. 187.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ад пазнання прыроды з мэтай яе пакарэння да абароны яе багаццяў ад разбурэння. Гэта было абумоўлена пільнай увагай паэта як да пазнавальнага, так і да сацыяльна-маральнага аспекту праблемы "чалавек і прырода". Значнасцю і глыбінёй пастаўленых пытанняў тэма "чалавек і прырода" садзейнічала павышэнню агульнага мастацкага ўзроўню ўсёй паэзіі С.Грахоўскага. Вершы, прысвечаныя гэтай тэме, выдзяляюцца сваёй публіцыстычнай вастрынёй, эмацыянальнай насычанасцю, экспрэсіўнасцю, паэтычнай выразнасцю.

У раздзеле дысертацыі тэкстуальна аналізуецца аўтабіяграфічная аповесць С.Грахоўскага "Зона маўчання", дзе паказваецца невядомае да апошніх часоў жыццё ў сталінскіх лагерах, паказваецца поўна, аб'ектыўна, без усялякіх "табу". Адзначаецца, што пісьменнік адным з першых у беларускай літаратуры імкнуўся даць максімальна поўную карціну калымскіх лагераў і выявіць асноўныя прыкметы не толькі лагернага, але і вольнага жыцця. Характэрнымі рысамі сталінскага грамадства аўтар называе страх, недавер, падазронасць, скрытнасць, усеагульнае няведанне, здраду ва ўсіх яе праявах, разбэшчанасць, падман, сляпую веру і рабскую псіхалогію. У творы на першы план вылучаецца чалавек і тое "чалавечае", што вытрымала выпрабаванне ў жорсткіх умовах турмы і лагера. Разам з тым падаецца бескампрамісны аналіз цёмных бакоў душы чалавека.

У аповесці востра пастаўлена пытанне: "Што ёсць чалавек; ці можа ён супрацьстаяць жорсткім абставінам?" Пісьменнік паказаў, як гэта небяспечна, "калі чалавек станавіўся рабом страўніка, траціў годнасць і сорам, пачынаў лазіць па памыйніцах і сметніках, вылізваць у сталоўцы чужыя міскі, рабіўся "шакалам" ("Туфта"). Важна ведаць, што пекла пачынаецца за межамі зоны, калі адным людзям даецца права распараджацца лёсам другіх, яно пачынаецца з пазбаўлення правоў "класава чужых".

Пісьменнік перадае дух, атмасферу часу, малюе тыповыя характары ў тыповых абставінах, у прыватнасці, следчага – супрацоўніка НКУС ("Чаму? За што? Навошта?", "Аднакласнічак"). Падаецца ланцужок паступовага знішчэння чалавека: голад, холад, пабоі, непасільная паднявольная праца, хранічнае недаяданне, "стукацтва" прытуплялі ў падняволеных усе пачуцці і жаданні. Можна сцвярджаць, што С.Грахоўскі (у гэтым ён набліжаецца да В.Шаламава) імкнецца даследаваць прыроду чалавека, паказаць, як яна выяўляецца пры набліжэнні героя да стану "зачалавечанасці" ("Этапы. Этапы. Этапы", "Смерць Ангела", "У шалмане","Федзя Беляноў"). Аўтар разглядае суадносіны цялеснага і духоўнага, біялагічнага і сацыяльнага ("Глухата", "Апошні лагпункт", "Нявольнікі-артысты"). І прыходзіць да высновы: "*У самай страшнай бядзе толькі чалавек ратуе чалавека, толькі дабро і спагада вядуць з безнадзейнасці да жыцця і збавення*"[23].

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

У заключнай частцы дысертацыі падводзяцца вынікі навуковага даследавання:

1. Аналіз паэтычных твораў С.Грахоўскага канца 20-х – пачатку 30-х гадоў XX стагоддзя дае падставы для наступных высноў: па сваёй ідэйнай накіраванасці,

[23] Грахоўскі С.І. Выбраныя творы. У 2 т. – Мінск: Маст. літ., 1994. – Т. 2: Крыжовы шлях: Аповесці. Апавяданні. – С. 4.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

асноўным змесце, агульным эмацыянальным ладзе яго лірыка гэтага часу блізка стаіць да творчасці паэтаў-маладнякоўцаў. Гэта праяўляецца перш за ўсё ў тэматыцы твораў, у падыходзе да з'яў жыцця, у спосабе адлюстравання рэчаіснасці ("Героі перамог", "Так пачнецца вясна", "Ільнаводу", "Чацвёртая вясна", "Пачынаецца дзень У СЕМ..."). Пра ўбачанае і перажытае паэт пісаў у стылі свайго часу – сцісла, дакладна, аператыўна, у форме рамантычна-прыўзнятага, павышана-экспрэсіўнага, але часам і павярхоўнага адлюстравання рэчаіснасці [2, 5].

Цяжкім быў шлях паэта да набыцця свайго голасу, свайго героя. З'яўляліся вершы-аднадзёнкі, не сагрэтыя сапраўдным пачуццём ("Турксіб", "Барасбі"). Імкненне да лаканізму, кампазіцыйнай стройнасці, вобразнасці мовы, уласцівыя пазнейшым творам С.Грахоўскага, дало свой плён: выявілася асноўнае, прывабнае ў лірычным героі – самаахвярнасць, дабрыня, шчырасць пачуцця [5, 7].

2. Канец 50-х – першая палова 80-х гадоў – значны і важны этап у творчай эвалюцыі С.Грахоўскага. Ужо ў першым зборніку вершаў "Дзень нараджэння" выявіліся тэндэнцыі, якія ў далейшым вызначаць своеасаблівасць творчай манеры мастака: уменне глыбока пранікаць у псіхалогію чалавека, вытлумачваць сутнасць з'яў, з пазіцый гуманізму падыходзіць да рэчаіснасці. Вершы паэтычнага зборніка "Дзень нараджэння" вызначаліся мяккім лірызмам, выразнасцю ўражанняў, і разам з тым у іх пакуль пераважае апісальнасць, падкрэслена-наіўная прастата асацыяцый. Спроба паэта адлюстраваць час яшчэ не магла зліцца з задачай выяўлення лірычнага хвалявання. У паэтычных зборніках "Чаканне" (1960), "Табе зайздросціць сонца" (1963), "Памяць" (1965), "Тры вымярэнні" (1967) паглыбляецца лірыка-публіцыстычнае гучанне твораў. Прырода і праца, радасць кахання знаходзяцца ў цэнтры ўвагі паэта, але ўсе традыцыйныя тэмы афарбаваны каларытам эпохі. Прычым жанравая своеасаблівасць лірыкі паэта знаходзілася ў залежнасці ад яго мастацкай канцэпцыі жыцця і часу, актыўнасць лірычнага хвалявання ўзмацняла дзейснасць паэтычнага слова, вызначаючы развіццё вершаў: ад публіцыстычных вершаў-рэпартажаў, вершаў-замалёвак да глыбока лірычных вершаў-роздумаў, маналогаў, споведзей [1, 6, 11].

З 70-х гадоў паглыбляецца філасофская плынь у творчасці паэта. Гэта было выклікана неабходнасцю больш поўнага асэнсавання часу, гістарычнага вопыту мінулага і сучаснага, неабходнасцю асэнсавання перспектыў жыцця і свайго прызначэння. Сведчанне таму – зборнікі "Паэма дарог" (1970), "Зазімак" (1976), "Зачараванасць" (1978). Менавіта ў гэтых кнігах выразна выявіліся вынікі творчых пошукаў мастака: галоўным іх арыенцірам сталі вечныя катэгорыі дабра, міласэрнасці, спачування. Паэт менш увагі засяроджвае на знешнім факце, апісанні, а больш арыентуецца на асэнсаванне ўнутранай сутнасці з'яў, знешняе ўсё часцей уключаецца ў арбіту роздумаў над пытаннямі жыцця і смерці, шчасця, кахання, узаемаадносін чалавека з прыродай і грамадствам [3, 10].

Заслугоўвае ўвагі шырыня тэматычнага ахопу рэчаіснасці. Галоўныя пытанні, якія канцэнтруюць у сабе асноўны змест лірыкі мастака – чалавек і час, сэнс быцця, маральна-этычныя праблемы раскрываюцца праз прызму філасофскага асэнсавання рэчаіснасці, набываюць элегічна-эмацыянальную афарбоўку. Спалучэнне этыка-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

філасофскага, эстэтычнага і рамантычнага пачаткаў – характэрная асаблівасць паэзіі С.Грахоўскага адзначанага перыяду [1, 3, 12].

3. У 70 – 90-я гады пільна разглядаюцца суадносіны: творчая асоба – час, чалавек – таталітарнае грамадства, пісьменнік – паднявольная краіна, пісьменнік – абноўленае грамадства. Як сродак і спосаб асэнсавання часу і жыцця выступаюць успаміны. Успамінаюцца маленства і юнацтва, першае каханне, Вялікая Айчынная вайна, рэпрэсіі, пакуты ў турмах і лагерах.

Тэма памяці пра Вялікую Айчынную вайну выражаецца паэтам у розных аспектах. Мастак шукае новыя формы для таго, каб паказаць недарэчнасць і жорсткасць вайны; яна адлюстроўваецца апасродкавана – праз пакалечаныя лёсы, не заўсёды бачныя душэўныя раны ("Вечны салдат", "Ваенныя фільмы", "Боль", паэма "Бяссмертнікі"). Пісьменнік засяроджвае ўвагу на сацыяльна-маральных уроках вайны, гістарычным значэнні подзвігу народа. У большасці твораў, аб'яднаных тэмай памяці пра вайну, гучаць элегічныя матывы [9]. Элегічную танальнасць маюць і вершы, прысвечаныя паказу рэпрэсій, жудасных выпрабаванняў, што вядзе да роздуму пра лёс цэлага пакалення, лёс краіны ("На самоце", "Страчаная маладосць", "Даруйце", "Ад вінаватых без віны"). Матыў памяці ў гэтых творах мае філасофска-псіхалагічную афарбоўку. Для твораў, аб'яднаных гэтай тэмай, характэрна паяднанне "я" – памяці пісьменніка, "я" – памяці грамадзяніна, "я" – памяці асобы з гістарычнай памяццю "мы" – гістарычнай памяццю Радзімы [9, 11].

У сваіх празаічных творах (зб. "Які вялікі дзень", "Сустрэча з самім сабою") пісьменнік схільны да адлюстравання маральна-этычных праблем, актуальных і для нашага часу, да пастаноўкі і мастацкага вырашэння рознага кшталту канфліктаў праз складаны ўнутраны свет герояў, да разгортвання вострых жыццёвых калізій. Для найбольш цікавага і разнастайнага раскрыцця ўнутранага свету герояў пленна асвойваюцца С.Грахоўскім такія мастацкія сродкі, як унутраныя маналогі, дыялогі, характарыстыкі, знешні партрэт, успаміны.

4. З канца 80 –х і ў 90-я гады XX стагоддзя пачынаецца трэці этап творчай эвалюцыі С.Грахоўскага, узлет яго паэзіі і прозы. Мастак цалкам адмаўляецца ад ранейшых псеўдаідэалаў, звяртаецца да агульначалавечых каштоўнасцей, да хрысціянскіх абрадаў і традыцый. "Залатое дзесяцігоддзе" характарызуецца пашырэннем жанрава-тэматычных абсягаў, паглыбленнем псіхалагізму, філасафічнасці, ростам майстэрства. Паэзія набывае публіцыстычнае гучанне. С.Грахоўскі пакутуе "за сябе і за народ", яго хвалююць балючыя праблемы сучаснасці ("Чарнобыльскі чад", "Салаўіны плач", "Гараць лясы", "Боль", "Глухі", "Сумленне", "Дарэмны крык", "Чарга", "Клопат", "Дэмакратыя", "Павадыры","Вясёлая мама" [11].

Разам з тым, не страчваючы грамадзянскага пафасу, лірыка С.Грахоўскага ўсё глыбей раскрывае супярэчлівы стан душы лірычнага героя: сумненні ў сабе, дасягнутых ідэалах, жаданне набыць новыя, невядомыя дасюль сувязі са светам, зразумець яго рух. Матыў неадплатнага доўгу перад людзьмі, бязлітаснага патрабавання да сябе выходзіць на першы план. У жанравай сістэме С.Грахоўскага сцвярджаецца лірычная мініяцюра, лірычны маналог, элегія, прасякнутыя глыбокім роздумам над праблемамі часу [8, 11].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. Аналіз вершаў, прысвечаных узаемаадносінам чалавека з прыродай, дае падставы сцвярджаць, што гэта праблема вырашаецца паэтам на новым мастацкім узроўні. С.Грахоўскі-паэт не толькі вядзе гаворку пра абвостраны канфлікт паміж чалавекам і прыродай, а і настойліва шукае выйсце з такога драматычнага становішча. Магчымасць дасягнення гармоніі ў адносінах грамадства са светам прыроды паэт бачыць у вырашэнні дзвюх неадкладных задач: у больш глыбокім пазнанні прыроды і ў выхаванні ў сучасніку пачуцця высокай маральнай адказнасці за яе далейшы лёс. Гэта было абумоўлена пільнай увагай паэта як да пазнавальнага, так і да сацыяльна-маральнага аспекту праблемы "чалавек і прырода". Асаблівасць вырашэння паэзіяй пазнавальнага аспекту заключаецца перш за ўсё ў перанясенні яго акцэнту ад задач пазнання прыроды з мэтай яе пакарэння да пазнання дзеля абароны яе багаццяў ад разбурэння ("Літасць", "Перасцярога"). З мастацкіх сродкаў найбольш эфектыўна выкарыстоўваюцца "ажыўленне" прыроды і зварот да чалавека ад яе імя. На думку паэта, антрапамарфізм з'яўляецца сцвярджэннем пазнавальнай сілы розуму чалавека, яго здольнасці пранікаць у глыбінныя таямніцы прыроды і разам з тым асэнсоўваць працэс яе існавання як сукупнасці жывых арганізмаў ("Ласіны след", "Пціч", "Лясы, лясы…"). Закранаючы сацыяльна-маральны бок адносін грамадства з прыродай, паэт даказвае ўзаемасувязь экалагічнага крызісу з крызісам духоўным. Тэхнічны прагрэс не толькі не вырашыў, але і ў значнай ступені абвастрыў супярэчнасць паміж прыродай і чалавекам. Далека не ўсякае пакарэнне прыроды ўспрымаецца як прагрэс [1, 3, 10].

Радзіма для паэта – гэта нешта вечнае, абсалютнае, і разам з тым – блізкае, зразумелае, а таму здольнае далучыць чалавека да прыроды, даць асобе адчуванне адзінства свету – і тым супрацьстаяць уласнай адзіноце, адчаю ("Зазімак", "Сум па снезе", "Роднае", "Кліча вясна", "Родны край") [10].

6. Пісьменнік адным з першых у беларускай літаратуры звярнуўся да выкрыцця сутнасці гулагаўскай сістэмы, імкнуўся наблізіць мастацкае адлюстраванне да рэальных падзей, "анатаміраваць" прыроду дабра і зла. У аповесці "Зона маўчання" на першы план вылучаецца чалавек і тое "чалавечае", што вытрымала выпрабаванне у пакутах. Разам з тым падаецца бескампрамісны аналіз цёмных бакоў чалавечай натуры. Пісьменнік паказаў, як небяспечна дапусціць занядбанне духоўных прынцыпаў ("Федзя Беляноў", "Жыццё-капейка", "Глухата" і інш.).

Вырашаючы пытанне аб уздзеянні лагера на душу чалавека, С.Грахоўскі прыходзіць да высновы, што ГУЛАГ – гэта звяно механізму сталінскай сістэмы, якая не здолела канчаткова знішчыць Веру, Спагаду, Дабро, хрысціянскія маральныя якасці, больш трывалыя ў параўнанні з каштоўнасцямі навязанай (турэмнай, дзяржаўнай і лагернай) маралі [4, 14].

Разгляд творчасці С.Грахоўскага 30 – 90-х гадоў ХХ стагоддзя дазваляе зрабіць вывад аб тым, што пісьменнік ішоў ад маладнякоўскай "квяцістасці", ад агітак і стэрэатыпаў, ад рыторыкі і афіцыёзу савецкага часу, да пратэсту і выкрыцця таталітарнай сістэмы; ад знешняга перайманя чужых узораў да свайго, выпакутаванага, празрыстага і гарманічнага стылю ў русле рэалістычнай класікі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### *Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках*

1. Маршалка (Борбат) Т.І. Усё жывое гіне ўвачавідкі: Праблемы экалогіі ў паэзіі С.Грахоўскага // Материалы исследований молодых учёных, аспирантов, соискателей: Сб. науч. ст. / Под ред. Е.А.Носовой. – Могилёв: МГУ им. А.А.Кулешова, 1999. – С. 131 – 134.
2. Борбат Т.І. Эпоха і мастак: Паэзія С.Грахоўскага канца 20-х – першай паловы 30-х гадоў // Весн. Магілёўс. дзярж. ун-та імя А.А.Куляшова. – 2000. – № 2 – 3 (6). – С. 119 – 124.
3. Борбат Т.І. Пейзаж у паэтычных творах С.Грахоўскага // Весн. Магілёўс. дзярж. ун-та імя А.А.Куляшова. – 2001. – № 1 (8). – С. 102 – 108.
4. Борбат Т.І. Этычная канцэпцыя існавання чалавека ў прозе С.Грахоўскага (на матэрыяле аўтабіяграфічнай аповесці "Зона маўчання") // Весці Бел. дзярж. педагагіч. ун-та. – 2001. – № 3. – С. 107 – 113.
5. Борбат Т.І. Апавяданне С.Грахоўскага "А маці не спіць" у кантэксце маральна-этычных праблем // У ракурсе сучаснага асэнсавання: Міжкафедральны зб. навук. прац, прысв. 90-годдзю МДУ імя А.А.Куляшова / Пад рэд. А.М.Макарэвіча. – Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2003. – Вып. 1. Філалогія. – С. 35 – 43.
6. Борбат Т.І. Спецыфіка рэцэпцыі паэтычнага зборніка С.Грахоўскага "Дзень нараджэння" ў кантэксце часу // Весн. Магілёўс. дзярж. ун-та імя А.А.Куляшова. – 2004. – № 1. – С. 101 – 107.

### *Матэрыялы канферэнцый*

7. Маршалка (Борбат) Т.І. Так пачыналася дарога...: Першыя паэтычныя крокі С.Грахоўскага // Материалы науч. конф. молодых учёных, аспирантов, соискателей, Могилёв, 10 – 11 марта 1997 г. / Могилёвс. гос. ун-т; Состав. М.В.Мащенко. – Могилёв, 1997. – С. 109 – 111.
8. Маршалка (Борбат) Т.І. Я.Колас і С.Грахоўскі: Урокі творчасці // Каласавіны: Матэрыялы рэсп. навук. канф., Мінск, 3 – 4 ліст. 1997 г. / Дзярж. літ.-мемарыял. музей Я.Коласа; Склад. М.Н.Далідовіч. – Мінск, 1998. – С. 116 – 117.
9. Маршалка (Борбат) Т.І. "А Беларусі жыць і жыць вякі...": Адраджэнскія матывы ў творчасці С.Грахоўскага // Канцэптуальныя пытанні развіцця мовы, літаратуры і мастацтва ў святле адраджэння культуры і духоўнасці беларускага народа: Зб. матэрыялаў рэсп. навук. канф., Мазыр, 23 – 24 крас. 1998 г. / Мазырс. дзярж. пед. ін-т; Гал. рэд. Т.М.Казачэнка. – Мазыр, 1998. – С. 291 – 295.
10. Борбат Т.І. "Не гоіцца даўняя рана": Памяць пра Вялікую Айчынную вайну ў паэзіі С.Грахоўскага // Кулешовские чтения: Материалы науч.-практ. конф. "Творчество А.Кулешова и историко-культурный процесс", Могилёв, 7 февр. 2001 г. / Могилёвс. гос. ун-т; Ред. совет: Я.И.Климуть и др. – Могилёв, 2001. – С. 67 – 69.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

11. Борбат Т.І. Мастацкае асэнсаванне "малой радзімы" як аснова лірыка-патрыятычных абагульнсиняў у паэзіі С.Грахоўскага // Проблемы истории и культуры Верхнего Поднепровья: Материалы Междунар. науч.-практ. конф., Могилёв, 25 – 26 окт. 2001 г. / Могилёвс. гос. ун-т; Под ред. Я.Г.Риера. Могилёв, 2001. – С. 151 – 153.
12. Борбат Т.І. Споведзь збалелага сэрца...: Роздум над сучаснай паэзіяй С.Грахоўскага // Акрыленыя словам: Зб. арт., успамінаў, падрыхтаваны на аснове матэрыялаў рэсп. навук. канф. 1999 года. / Магілёўс. дзярж. ун-т; Рэд. Я.І.Клімуць. – Магілёў, 2001. – С. 34 – 40.
13. Борбат Т.І. Паэтызацыя працы ў лірыцы С.Грахоўскага 60 – 70-х гадоў // Куляшоўскія чытанні: Матэрыялы Міжнар. навук. канф. "Творчасць А.Куляшова і адукацыйна-асветніцкія праблемы сучаснасці", Магілёў, 6 – 7 лют. 2002 г. / Магілёўс. дзярж. ун-т; Адк. рэд. М.І.Мушынскі. – Магілёў, 2002. – С. 27 – 29.
14. Борбат Т.І. Кантраст у прозе С.Грахоўскага (на матэрыяле аўтабіяграфічнай аповесці "Зона маўчання") // Куляшоўскія чытанні: Матэрыялы Міжнар. навук. канф., Магілёў, 11 – 12 снеж. 2003 г.: У 2 ч. / Магілёўс. дзярж. ун-т; Адк. рэд. М.І.Вішнеўскі. – Магілёў, 2004. – Ч. 2. – С. 175 – 177.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

# РЭЗЮМЕ

**Борбат Таццяна Іванаўна**

**Творчасць Сяргея Грахоўскага: асаблівасці ідэйна-мастацкай эвалюцыі**

***Ключавыя словы:*** мастацкі вобраз, стыль, праблематыка, жанры, эвалюцыя, асаблівасці паэтыкі, час, памяць, сумленне, ідэйна-эстэтычныя пошукі, светабачанне, спавядальная проза.

***Аб'ект даследавання***: творчасць С.Грахоўскага, яе праблематыка, стыль і жанравая своеасаблівасць.

***Прадмет даследавання:*** творчая эвалюцыя С.Грахоўскага ў літаратурна-грамадскім кантэксце 30 – 90-х гадоў XX стагоддзя.

***Мэта даследавання:*** ахарактарызаваць этапы станаўлення творчай індывідуальнасці С.Грахоўскага, вызначыць пры гэтым дамінантныя рысы яго паэзіі і прозы, выявіць жанравыя асаблівасці і раскрыць адметнасці стылю, асэнсаваць творчасць пісьменніка ў кантэксце беларускай літаратуры XX стагоддзя.

У часе даследавання выкарыстоўваліся наступныя літаратуразнаўчыя метады: *канкрэтна-аналітычны, параўнальна-гістарычны*, *біяграфічны* (часткова).

У працы ўпершыню ажыццяўляецца комплекснае даследаванне мастацкай творчасці С.Грахоўскага і яе эвалюцыі, выяўляюцца і характарызуюцца жанравыя мадыфікацыі твораў паэта на розных этапах яго літаратурнай дзейнасці, раскрываюцца своеасаблівасці стылю.

Адзначаецца, што С.Грахоўскі – мастак з выразнай творчай эвалюцыяй: ішоў ад маладнякоўскай "квяцістасці", ад агітак і стэрэатыпаў, ад рыторыкі і афіцыёзу савецкага часу, да пратэсту і выкрыцця таталітарнай сістэмы; ад знешняга пераймання чужых узораў да свайго, выпакутаванага, празрыстага і гарманічнага стылю ў русле рэалістычнай класікі. У працы сцвярджаецца, што агульная атмасфера і літаратурны кантэкст 30 – 90-х гадоў мінулага стагоддзя ў многім прадвызначылі спецыфіку паэтычнага адлюстравання рэчаіснасці С.Грахоўскім, актуалізавалі яскравыя праявы яго таленту. Усебаковае ж даследаванне творчасці гэтага мастака слова дае магчымасць раскрыць некаторыя важныя і значныя рысы ўсяго літаратурнага працэсу другой паловы XX стагоддзя.

Матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваюцца ў выкладанні курса гісторыі беларускай літаратуры XX ст. у МДУ імя А.А. Куляшова.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# РЭЗЮМЕ

**Борбат Татьяна Ивановна**
**Творчество Сергея Граховского: особенности идейно-художественной эволюции**

***Ключевые слова:*** художественный образ, стиль, проблематика, жанры, эволюция, особенности поэтики, время, память, совесть, идейно-эстетические поиски, мировидение, исповедническая проза.

***Объект исследования:*** творчество С.Граховского, его проблематика, стиль и жанровое своеобразие.

***Предмет исследования***: творческая эволюция С.Граховского в литературно-общественном контексте 30 – 90-х годов XX столетия.

***Цель исследования***: охарактеризовать этапы становления творческой индивидуальности С.Граховского, определить при этом доминантные черты поэзии и прозы художника слова, раскрыть особенности стиля и охарактеризовать жанровое своеобразие его произведений, показать место творчества писателя в истории белорусской литературы XX столетия.

Во время исследования использовались следующие литературоведческие методы: конкретно-аналитический, сравнительно-исторический, биографический (частично).

В работе впервые осуществляется комплексное исследование творчества С.Граховского и его эволюции, выявляются и характеризуются жанровые модификации произведений поэта на разных этапах его литературной деятельности, раскрываются особенности стиля.

Отмечается, что С.Граховский – писатель с выраженной творческой эволюцией: от молодняковской колоритности, стереотипов, от риторики и официоза советского времени до протеста и разоблачения тоталитарной системы, от использования чужих образцов до своего, освещённого личной судьбой, гармоничного стиля в русле реалистической классики. В работе утверждается, что общая атмосфера и литературный контекст 30 – 90-х годов прошедшего столетия во многом предопределили специфику поэтического отражения С.Граховским действительности, актуализировали яркие проявления его таланта. Всестороннее исследование творчества этого художника слова дает возможность раскрыть некоторые важные и значимые черты всего литературного процесса второй половины XX столетия.

Материалы диссертации используются в преподавании курса истории белорусской литературы XX века в МГУ имени А.А.Кулешова.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## SUMMARY

**Borbat Tatyana Ivanovna**
**Creative Work of Sergei Grakhovsky: the peculiarities of ideological-artistic evolution**

***Key words:*** artistic image, style, problems, genres, evolution, poetic peculiarities, time, memory, conscience, ideological-aesthetical searching, interpretation of the world, confessional prose.

***Object of investigation:*** creative work of Sergei Grakhovsky, its problems, style and genre peculiarities.

***Subjec of investigation:*** creative evolution of Sergei Grakhovsky in the literary and public context of the 30 – 90-e 20 th century.

The aim of the investigation is to characterize the stages of the formation of Grakhovsky's creative individuality, no define the basic features of the author's poetry and prose, to reveal stylistic peculiarities of his works, to show the place of the author's creative work in the History of Belarussian literature.

During the investigation the following literary methods were used: concrete-analytical, comparatively-historical, partially biographical.

For the first time the thesis contains a complex investigation of Grakhovsky's creative work and its evolution, it reveals and characterizes the principles of the transformation of genre changes of the poet's works at different stages of his literary activity, it reveals style peculiarities.

It is mentioned that Sergei Grakhovsky is an author with a significant creative evolution: from the youth's vividness, stereotypes, from rhetoric and semiofficial organ of the Soviet time to the protest and the exposure of the totalitarian system, from the use of someone else's models to his own harmonious style, brightened by his personal fate in the course of the realistic classics. The thesis states that the general atmosphere and the literary context of 1930 – 1990-e predetermined in many respects the specific character of the reality poetically reflected by S. Grakhovsky, actualized vivid manifistation of his talent. The detailed research of the author's creative work gives the opportunity to reveal some important and significant features of the whole literary process of the second half of the 20 th century.

The material of the thesis is used in teaching the course of the History of Belarussian Literature of the 20 th century at the Mogilev State University named after A.A. Kuleshov.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ліцэнзія ЛВ № 384 ад 30.04.1999.
Здадзена ў набор 13.04.2004. Падпісана да друку 14.04.2004.
Фармат $60x84^{1}/_{16}$. Папера афсетная № 1. Гарнітура Times New Roman Cyr.
Ум.-друк. арк. 1,2. Ул.-выд. арк. 1,5. Тыраж 100 экз. Заказ № 130

Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт
імя А.А. Куляшова", 212022, Магілёў, Касманаўтаў, 1

Надрукавана на рызографе аддзела аператыўнай паліграфіі
МДУ імя А.А. Куляшова. 212022, Магілёў, Касманаўтаў, 1